Біблятэка БЕЛАРУСКАЕ ДУМКІ

Printed by The WHITERUTHENIAN PRESS
Central Square, New York

СМАЛЕНШЧЫНА *** АДВЕЧНАЯ ЗЯМЛЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДУ

З гор паглядае прыгожы Смаленск
цераз прысады а блоні свае.
Замак і цэрквы ў даліны глядзяць,
цяжкія дні ім прыйшлося зазнаць.
Тут адбываліся бойкі ня раз,
тут задрамаў, затрымаўшыся, час.
Сяньняшняй бойкі ня чулі вякі,
гэтакай цяжкай ня зналі рукі.
Павадкай дзікай прайшлі па зямлі,
новы тэстамэнт няволі далі...
Сьціх і скарыўся магутны Дняпро...

Ул. Дубоўка

І. АБ ЧЫМ ГАВОРАЦЬ СТАРЫЯ ЛЕТАПІСЫ

Смаленск... Як шмат гістарычных успамінаў будзіць гэтае слова, як многастайна ў дазнаным ведаю мінулага ўяўленьні паўстае багатая на падзеі гісторыя гэтага гораду, крывіцкага краю і народу. А гісторыя Смаленску, як крывіцкага гораду, пачынаецца яшчэ ад незапомных часоў. Бадай усе першыя летапісы з гісторыі славянства ўжо ўспамінаюць Смаленск, як палітычны цэнтар крывічоў, яшчэ ў пэрыядзе паганскае старавечнасьці, калі крывічы калянізавалі шырака поўнач і ўсход Беларусі і крывіцкія паселішчы паўставалі ў Вазёрным краі аж да самага Белавозера, а на ўсходзе і паўдні да Акі і Дону. Побач з Ізбарскам і цэнтрам падзьвінскіх крывічоў — Полацкам, — навет раней за яго, называецца цэнтар усходніх Пры-

дняпроўскіх крывічоў — Смаленск.

Смаленск быў цесна зьвязаны ў эканамічных і тэрытарыяльных дачыненьнях з слаўным Полацкам. Лучылі іх інтарэсы Дняпра—Дзьвінскага воднага шляху, якім ішоў гандаль заходніх ґотаў з усходнімі баўгарамі і хазарамі; эканамічна лучыў іх вялікі водны шлях "з варагаў у грэкі". Ажыўлены гандаль праз гэтыя шляхі багаціў Полацак і Смаленск, а раньняе палітычнае вылучэньне ў васобныя дзяржаўныя адзінкі рабілі іх гаспадарамі над шмат якімі суседнімі племеньнямі, якіх яны ўзалежнівалі ў дзяржаўным дачыненьні. Шмат якія назовы мясцовасьцяў і паселішчаў, што паходзяць ад слова "крывіч", як Крывец, Крэчаны, Крыўскае, Крэва, Крывозны і г.д., што сустракаюцца ў вялікай колькасьці ў землях Радзімічаў, Севераnaў, Дрыгвічоў, сьцьвярджаюць,што крывічы надта далёка пашырылі сваё расьсяленьне. У дзяржаўнай залежнасьці ад вялікага племя Крывічоў і іхнага цэнтру Смаленску была і Северанская зямля. Аб гэтым у "Повести древних времен" гаворыцца:

"И по сих братии /пасьля Кія, Шчэка і Харыва/ држаці почаша род іх княжение в Полях, а в Деревлях свое, а Дрьгевичи свое, а Словене свое Нов'егроде, а другое на Полоте, иже и Полочане, от них же и Кривичи, иже седять на вьерх Влги и на верх Двини и на вьерх Днепра, іх же град есть Смольнск; туда бо седят Кривичи; таже Север от них".

Зьліваючыся з северанаўскімі, радзіміцкімі і дрыгавіцкімі землямі ў працэсе калёнізацыі гэтых земляў, яшчэ ў тыя пачатковыя для сваёй гісторыі часы яны далі той асобны

славянскі тып беларусаў, які становіць цяпер зусім непадобную да расейцаў нацыю. Этнаграфічнай і расавай чысьціні полацкіх і смаленскіх крывічоў спрыяла раньняе дзяржаўнае самавызначэньне і магутнасьць, набытая дзякуючы этнаграфічнаму, эканамічнаму і геаграфічнаму адзінству.

Аб велічы і значэннасьці Смаленску ў тыя старадаўныя часы гавораць і летапісныя весткі пра паход 865 г. вараскіх баяраў Аскольда і Дыра, якія з згоды Рурыка пайшлі ў Царгорад з родам сваім "И поидоста изь Новагорода по Днепру и идуче мимо Смоленск, и не явистася в Смоленску: зане град велик и мног людьми".

Той самы летапіс адзначае, як пазьней Смаленск, у 882 г., прызнаў залежнасьць ад Алега і Ігора, але усё-ж меў самастойнага князя і належыў, як раней, да вялікіх гаспадарстваў. Калі Алег у 907 годзе супольнымі славянскімі сіламі паняволіў Грэцкую зямлю і загадаў плаціць даніну — "рускім гарадом": перш Кіеву, так-жа Ноўгароду, а затым Полацку, Роставу, Смаленску і іншым, дык адразу-ж давалася тлумачэньне, што гэта вялікія княствы — "па тых бо гарадох сядзяць вялікія князі, якія знаходзяцца пад Алегам".

Гэтак, летапісы называюць гэткіх раньніх самастойніх князёў у Смаленску, як князя Станіслава, сына Валадзімера, затым Вячаслава Яраслаўага (ад 1054 г.). Канчальна вызвалiў Смаленшчыну ад усякае залежнасьці ад дынастыі русаў у 1128 г. і стварыў магутнае Смаленскае княства Расьціслаў Мсьціслаўіч, унук Манамаха (1125 — 1160 г.).

Смаляне хрысьціліся паводля прынятага ў

1013 г. хрысьціянства. А у 1137 г., імкнучыся да паступовага палітычнага самавызначэньня і навет духовае незалежнасьці ад русаў, за Расьціславам Смаленшчына вылучылася ў вашобную епіскопію. За першага япіскапа быў вучоны грэк Мануіл, пасьля ў гэтай ролі былі беларусы. Адгэтуль пачынаецца час культурнага і гаспадарскага росьцьвіту Смаленску — залатая пара незалежнага Смаленскага княства.

Гандлёвыя сувязі Смаленску, даўней з арабска-бізантыйскімі краямі, а гэтым часам і з захадам — Рыгаю, Готляндам ды іншымі нямецкімі гарадамі — багацілі горад.

У Смаленскіх курганах знаходзяць шмат бізантыцкіх і арабскіх манетаў VIII — XI ст. ст. Багата хлеба Смаленск вывозіў на свой хлебны рынак — Ноўгарад. Смаленскія купцы езьдзілі ў Суздаль і аж у Канстантынопаль. Немцы-ж самі прыяжджалі ў Смаленск і трывала тут асядалі. Ужо ў XIII ст. тут была цэлая нямецкая калёнія з сваёю царквою імя Божае Маці, якая мела і свой двор. За той самы час ведамыя ў гісторыі беларускае мовы і беларускага права гандлёвыя ўмовы, якія рабіў князь Мсьціслаў з Рыгаю і Готляндам, як, скажам, Смаленская Тарговая грамата ад 1229 г. і інш.

Гэтыя дакумэнты, пісаныя ў тагачаснай беларускай мове, сьветчаць пра пашыранасьць гэтае мовы далёка і за межамі Беларусі, а таксама і пра тое, што яна мела прызнаньне ў шырокіх колах замежных купцоў, як мова літаратурная, мова юрыдычных і гандлёвых дакумэнтаў і штодзённага ўжытку ў асьвечаных колах беларускага жыхарства.

II. СМАЛЕНШЧЫНА — СТАРАДАЎНЫ АСЯРОДАК БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ

Яшчэ перад афіцыйным прыняцьцем хрысьціянства беларускія купцы, разам з уплывамі хрысьціянства, прывозілі з Бізантыі і ўплывы бізантыйскае культуры. Пасьля таго, як княгіня Рагнеда з сваім сынам Ізяславам зьвярнулася з Кіева на Беларусь у 900 г. і абвесьціла тут хрысьціянства афіцыйнаю вераю, культурнае разьвіцьцё Беларусі пайшло шпаркімі тэмпамі наперад. Смаленшчына, хоць крыху і пазьней за Полаччыну прыняла хрысьціянства, але дзякуючы эканамічнаму ўздыму і высакаасьвечаным князём, што былі на пасадах у Смаленску, надта прычынілася да культурнага ўздыму Беларусі.

Тут у манастырох стварaліся культурныя асяродкі, з якіх паўставалі цэлыя літаратурна-асьветніцкія кірункі і школы з шмат якімі культурнымі дзеячамі і пісьменьнікамі.

Гэтаму вельмі спрыяў высокакультурны князь Расьціслаў і асабліва князь Раман (1160 — 1180). Гэты апошні ўсё сваё жыцьцё аддаў развою школьніцтва, дзеля чаго наймаў за мяжою, на захадзе і ў Бізантыі, высокаадукаваных, каб яны вучылі беларускую моладзь грэцкай і лацінскай моваў. Асьветна-культурнай справе князь Раман ахвяраў усе свае сродкі і багацьці.

"Князь Раман, — гаворыць летапісец, — аддаў на школы і кнігі ўсю сваю маёмасьць, і па сьмерці добрага князя Рамана смаленцы пахавалі яго сваім коштам, бо ў князеўскім скарбе ня было ніводнае капейкі".

Дзякуючы гэтай рупнасьці пра культуру і

асьвету з боку саміх князёў праз усе XII — XIII ст. смаленцы ўзьняліся ў тым часе на найвышэйшы ўзровень. Ужо ў XII ст. вылучаюцца выдатныя асобы культурных дзеячоў у Смаленску, як Клімэнт Смаляціч, Аўраам Смаленскі, мніх Апанас, прэзьбітар Хама, манах Ахрэм і інш. Гэткага кніжніка, як Клімэнт Смаляціч, як сьветчыць летапісец, датуль яшчэ ня было навет на ўсёй усходняй славяншчыне. Гэта быў высокаасьвечаны чалавек, глыбокі філёзаф, знаўца антычных пісьменьнікаў — Гамэра, Плятона і Арыстотэля. Спачатку быў ён мніхам-схімнікам, але, выклікаўшы сваёй адукаванасьцяй увагу высокапастаўленых асобаў у Кіеве і духоўнікаў у Смаленску, ён саборам мясцовых епіскапаў выбіраецца за мітрапаліта (1147 — 1154). Будучы абраным толькі саборам, а не пастаўленым канстантынопальскім патрыярхам, Клімэнт меў нямала супраціўнікаў і няпрыемнасьцяў. Але гэта-ж змушала яго ў абарону сваіх паглядаў пісаць нямала палемічных твораў і гэтак прычыніцца да развою беларускага пісьменства тае пары.

Гэтак, дайшло да нас ягонае "Пасланьне", напісанае ў вадказ на закіды свайго супраціўніка Хамы, што ён быццам у сваім лісьце да князя Расьціслава выхваляе сябе і выдае за лепшага філёзафа. Клімэнт адказаў, што ён ня шукае сьвецкае славы, багацьцяў, а дбае толькі аб душы і пасьмяротным збаўленьні. Да гэтага, ён уважае, можна прыйсьці праз духовае дасканаленьне чалавека.

Хама трымаўся літары сьвятога "Пісьма" і быў ворагам усякага творчага тлумачэньня яго. Клімэнт вызнаваў іншы пагляд — патрэ-

бы тлумачэньня сьв. Пісьма паводля твораў Гамэра, Плятона і Арыстотэля, і цьвердзіў, што гэта зусім ня зьмяняе сэнсу сьв. Пісьма, а даець яму новае алегарычна - сымбалічнае тлумачэньне. Гэтак беларус Клімэнт Смаляціч яшчэ у XII ст. ужо бачыў тое, што перамагло ў Эўропе куды пазьней — у эпоху адраджэньня і гуманізму. Мудрасьць і розум, дасканаленыя і шліфаваныя ведаю грэцкіх аўтараў у арыгінале, зрабілі тое, што сваім Пасланьнем Клімэнт Смаляціч зьявіўся пераканальнікам гуманізму на Беларусі яшчэ тады, калі ў Эўропе панавалі дагматызм і схалястыка з іхным перасьледам усякае вольнае думкі. Гэта важнае сьветчаньне духовае сілы беларускае творчае магутнасьці.

Клімэнт Смаляціч памёр у 1164 г. Але ён быў не адзіным. Побач з ім, другім паводля значэньня культурным беларускім дойлідам у гэтых часох, зьяўляецца Аўраам Смаленскі— бліскучы прамоўца-казальнік таго часу. У сваіх запальных прамовах, што зьбіралі ўсё смаленскае грамадзянства, ён уздымаў самыя актуальныя пытаньні свайго часу і выклікаў імі магутнае водгульле, якое будзіла жывую думку, уздымала інтэлектуальныя патрэбы людзей і штурхала іх на шуканьне духовага і культурнага здавальненьня, што спрыяла культурнаму развою.

Беларускае пісьменства таго часу ўзбагацілася яшчэ шмат якімі творамі смаленскіх аўтараў. Назавём тут такі выдатны літаратурны твор, як біяграфія Аўраама Смаленскага, напісаная ягоным вучнем Ахрэмам, аповесьці пра Мэркура, вандраваньні Ігната Смальляніна ў Палестыну і Канстантынопаль ды інш.

III. СМАЛЕНСК — НЕПЕРАМОЖНЫ ГОРАД КРЫВІЧОЎ

Змагаючыся ўвесь час за сваю незалежнасьць, баронячыся ад агрэсіі з Поўначы (Ноўгараду) і Паўдня (Кіева), а таксама з Захаду ад Літвы і з Усходу ад татарскае навалы, Смаленск здабыў сабе імя неперinаможнага гораду крывічоў. Доўга ніякія ворагі не маглі сходаць супраціву смаленцаў. Дзякуючы гэтаму, горад уратаваўся і ад татарскае няволі.

Гэтак, паводля смаленскае легенды аб сьв. Мэркуры, у 1238 г., калі татары сунуліся былі на Смаленск, іх спаткаў недалёка ад гораду з невялікім аддзелам смаленскіх жыхароў Мэркур і гэтак шмат перабіў іх, што тыя змушаныя былі ўцякаць. Калі татары агледзеліся, што смалянаў надта мала і зноў павярнулі на іх, дык на дапамогу выйшла шмат смаленскіх жыхароў і ў жорсткай бойцы зусім расьцярушылі татараў. Пярэпалах у татарскіх аддзелах і памяць аб гэтых паразах доўга стрымлівалі татараў ад намеру заваяваць гэты горад, а Смаленшчына тым часам ня мела жудаснае татарскае няволі. Нездарма народныя беларускія пагудкі пра гэраічныя ўчынкі Мэркура надаюць яму рысы беларускага нацыянальнага гэроя і малююць яго, як вернага вартаўнічага беларускае зямлі, свайго гораду і народу. На ягонай дамавіне, як нацыянальныя рэліквіі, смаленцы перахоўвалі ягоную зброю, піку і г.д.; яе надзявалі на новавянчаных беларускіх князёў — і ў Смаленску і ў Полацку, а ўсе беларускія сьвятыні імкнуліся мець хоць частачку зброі сьв. Мэркура. Гэтак ува Ўсьпенсім саборы знаходзіўся зялезны шалом і камашы з крывымі наскамі дасканальнае формы, у якіх, паводля паданьня, Мэркур біўся з батыевым войскам. Народ верыў, што ў часы напасьцяў на беларускую зямлю розных чужацкіх зграяў беларускі нацыянальны гэрой сьв. Мэркур уставаў з дамавіны, браў зброю, садзіўся на каня і нішчыў ворага, чым спрыяў крыўскім перамогам. Вось-жа таму і на шмат якіх пячатках часоў незалежных беларускіх княстваў ёсьць абраз сьв. Мэркура на кані і ў зброі. Гэтак у арэоле гераічнасьці, у вобразе народнага заступніка. выступае. ў народных. паданьнях сьвяты Мэркур.

Смаленская легенда аб сьв. Мэркуру — выдатны літаратурны помнік беларускага народу, слаўных балонаў ягонага змаганьня за самастойнасьць у часы княжага Смаленску. Мастацкая і гістарычная вартасьць гэтага помніку ня ніжэйшая за шмат якія эпічныя творы сусьветнае літаратуры. І дарма маскоўцы хочуць прысвоіць гэтага народнага беларускага гэроя сабе ды выкарыстоўваюць яго ў сваіх інтарэсах, выдаючы ягоныя гэраічныя чыны, як змаганьне за іхныя інтарэсы супроць татараў.

Беларускі народны эпас належыць беларусам і зьяўляецца іхным неадымным духовым скарбам. Духовая творчасьць, як і ўсе гэраічныя чыны, з правам павінны належаць скарбніцы беларускага нацыянальнага генія.

IV. ЗМАГАНЬНЕ ЗА СМАЛЕНСК

Багацьці і стратэгічнае значаньне Смаленску ўжо ў XIII ст. пачынаюць прыцягваць да

сябе ўвагу заходніх і ўсходніх заваёўнікаў. Рэч у тым, што праз Смаленшчыну праходзіць Вялікі Эўрапейскі вададзел, што дзеліць басэйны Дзьвіны і Дняпра, якія ўтвараюць тут вузкую браму, яе як-бы затыкае сабою сам горад Смаленск.Вось-жа ўважаючы на тое,што Дзьвіна з поўначы і Дняпро з усходу зьяўляюцца добрымі стратэгічнымі межамі і прыроднымі перашкодамі для праходу чужым войскам і добрымі абароннымі становішчамі (а Смаленск — ключом да гэтае Смаленскае брамы), кажны, натуральна, хацеў валодаць гэтым ключом, каб быць поўным гаспадаром над гэтым, высунутым на ўсходзе для захаду і на захад для ўсходу, пляцдармам.

Таму ўжо ад XIII ст., каб валодаць Смаленскам, робяць высілкі суседнія палітычнадзяржаўныя згуртаваньні — Суздаль — Масква і новастворанае геніем Мендаўга ў Наваградчыне Літоўскае Гаспадарства.

Сваёй палітычнай мудрасьцю Мендаўг зразумеў значаньне Смаленску для роста магутнасьці маладога беларускага гаспадарства, творанага праз задзіночаньне пад ягонаю ўладаю ўсіх беларускіх земляў. Мендаўг першым сярод беларускіх князёў задзіночанага гаспадарства робіць спробу падпарадкаваць Смаленск сваёй уладзе. З дапамогаю свайго пляменьніка Ердзавіда ён і завалодаў ім на нейкі час. Але тым-жа самым часам ня мог на гэтае абыякава глядзець другі, усходні цэнтар — Суздальскае княства. Калі не забывацца і на тое, што Смаленск датуль жыў незалежным княжым жыцьцём і ў ім моцна жылі сэпаратыўныя імкненьні, дык не даводзіцца дзівіцца, чаму дапамога Суздальскага князя Яраслава

Усеваладавіча вырвала Смаленск з-пад Мендаўгавае ўлады.

Але тымчасам Смаленск зноў апынуўся паміж дзьвума сіламі — Літвой і татарска-мангольскай небясьпекай з усходу. Аднаму яму абараніцца ад татарскага націску ня было моцы. Гордае нясхіленьне перад усходнімі сіламі выклікала вялікія напасьці — суздальскія і маскоўскія князі наводзілі татарскіх ханаў і нацкоўвалі іх на смалянаў. Гэтак, у выніку правакацыяў, Смаленск у 1274 г. ужо быў змушаны аднойчы прызнаць залежнасьць ад ханскай арды. Арыентацыя на ўсход не ратавала. А выбіраць трэ' было. Ня дзіва, што Смаленск пачаў аглядацца на захад, на Беларускую дзяржаву, г. зв. Літоўскае княства. Гэта была здаровая ў сваёй аснове, пакуль яшчэ не расшматаная рэлігійным змаганьнем і нутранымі супярэчнасьцямі дзяржава з лепшым для тых часоў на ўсходзе Эўропы законадаўствам, з рэлігійнаю свабодаю і народапраўствам, з высокаю культураю.

Пры далучэньні новых тэрыторыяў да беларускага гаспадарства праводзіўся прынцып “старыны не парушаем, а навіны ня ўводзім”. Устаўныя граматы, што даваліся далучаным князём і вялікім гарадом, забясьпечвалі ім значныя правы самаўрадаваньня і фактычна былі канстытуцыйнымі граматамі асобных земляў.

Дзякуючы гэтаму, Полацкая, Віцебская і Смаленская землі, увайшоўшы ў Вялікае Княства, фактычна заставаліся як-бы асобнымі княствамі. Захоўваліся навет усе абавязкавыя для гэтага дваровыя пасады — маршалка, канюшага, лоўчага, акольнічага, сакаль-

нічага, баброўнічага, ключніка і г. д.

Усе яны выбіраліся з мясцовых беларусаў, гэтаксама як і на вялікакняжага намесьніка часьцей выбіралі мясцовага баярына.

Нядзіва, што Смаленск пачынае ўваходзіць у прыязныя дачыненьні з г. зв. Літвою. Гэтак, Гедымін робіць з Смаленскім князем Іванам Аляксандравічам хаўрус супраць татарскага хана. За Альгердам смаленскі князь называе сябе "малодшым братам" літоўскага князя.

Аднак-жа, дарма, што былі ўсе гэтыя абставіны, якія спрыялі прыязьні Смаленску да Літоўскага княства, ён быў усё-ж такі зарабаваны гвалтам маскоўцамі і за яго давялося на працягу гісторыі шмат ходацца з Масквою. Тлумачыцца гэта тым, што надта моцнымі былі ў смаленцаў традыцыі волі, незалежнасьці. Масква выкарыстоўвала гэтыя свабодалюбныя пачуцьці смаленцаў і накіроўвала іх супраць Літвы, а таксама карысталася часта вайсковымі сіламі Смаленску ў сваім змаганьні за вызваленьне Маскоўшчыны ад татарскае няволі і інш. Гэтак, беларускае смаленскае войска князя Сьвятаслава Іванавіча брала ўдзел у змаганьні расейскага войска Дзімітры Донскага на Куліковым полі супраць татараў. Тут, як і ў шмат якіх іншых войнах, крышыліся беларускія косьці за чужацкія інтарэсы. Лілася беларуская кроў бязь меры, аб чым некалі добра сказаў у вершы "О Крыўская Зямля" В. Ластоўскі:

"Крывёй сыноў Тваіх
Куплялі славу гучную
На Грунвальду палёх.
Ад дзікае арды баронячы Заход
Тваіх байцоў касьцісты вал палёг!

Бязыменнаю, а ўсё-ж тваёй крывёй
Паліты Хоціма даліны:
І па-над Калкаю ракой
Маскальскія нізіны...
Арошаны крывёй Тваіх сыноў Іпранскі
край,
Само-Сьера, Райн, Аара, По, Сівы Дунай!..
О, так, гаротныя Крыўцы,
Ламалі косьці за чужую справу;
Сваёй крывёй і мазалём
Ішлі купляць чужынцам славу!"

V. КРАСАВАНЬНЕ СМАЛЕНШЧЫНЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ГАСПАДАРСЬЦЬВЕ

З гледзішча беларускіх інтарэсаў спроба вялікага князя Альгерда далучыць Смаленск да Беларускае Дзяржавы была прагрэсыўнай і ў вабставінах панаваньня беларускае культуры не азначала асаблівае страты народных свабодаў пары незалежнасьці Смаленску. Але аднак падбухторваньне Масквы штурхала смаленскіх князёў на супраціў, хоць Альгерду ўдалося здабыць Смаленскі горад Мсьціслаў.

Пасьля сьмерці Альгерда, смаленскі князь Сьвятаслаўіч скарыстаў часовае замяшаньне на Беларусі і выступіў супраць беларускіх гарадоў. Але бойка ля Воршы дала перамогу беларускаму войску князёў Скіргайлы, Вітаўта ды інш., якое гнала смаленцаў да самага Смаленску. Ды дарма, што была перамога, харобрасьць і магутнасьць супраціву смаленцаў выклікала зьдзіўленьне і спачуваньне пераможцаў да сьвіх-жа аднакроўных братоў, і пераможцы ўзялі з іх толькі кантрыбуцыю. Але

ў палітычным дачыненьні смаленскія князі адгэтуль зьяўляюцца як-бы толькі намесьнікамі Вялікага князя Літоўскага і, калі трэба было, замяняюцца на іншых. Гэтак, вялікі князь Вітаўт пасьля 1395 г. замяніў смаленскага князя Юр'я на ягонага брата Глеба. А калі смаленцы пачалі гучна выказваць з гэтага повады сваё незедавальненьне, Вітаўт рушыў з войскам на Смаленск, здабыў яго, заарыштаваў варожых яму князёў, а на княжы пасад прызначыў намесьніка Ямонта.

Толькі перамога войскаў хана Ядыгея пры Ворсклі і параза Вітаўта вярнулі Смаленску князя Юр'я. Але ня годзіцца з гэтым слаўны Вітаўт і колькі разоў спрабуе зноў здабыць Смаленск. Урэшце. скарыстаўшы ад'езд Юр'я ў Маскву, Вітаўт аблажыў горад , і той змушаны быў здацца.

Гэтак старадаўны крывіцкі Смаленск ад 24. VI. 1404 г. стаўся складоваю часткаю непадзельнага цэлага — Вялікага Беларускага княства.

Разам з вывадам маскоўскіх элементаў беларускія валадары пачалі даваць жыхарам Смаленску вялікія палёгкі, асабліва ў гандлі. Нездарма за беларускіх часоў Смаленск надта вырас, як горад. Было збудавана шмат новых цэркваў, будынкаў, паўстала шмат новых школаў. Рэлігійная лёяльнасьць і талерантнасьць у Беларускай Дзяржаве спрыяла развою асьветы. Гэты пэрыяд асабліва прычыніўся да эканамічнага ўздыму гораду. Гэта быў век росьцьвіту смаленскага гандлю. Гандляваць, апрача княжнага места, пачаў сам горад. Цэлы шэраг палёгкаў гандляром прывабіў багата купцоў з Полацку, Віцебску, Дарагабужу, з-за мяжы, з Ноўгараду, Разані, Цьверы, Масквы і г.д.

З нястрыманаю хутчынёю расьлі гандлёвыя шэрагі. На месцы пустошаў паўставалі новыя гандлёвыя пункты, рынкі, крамы, склады. Вакол асядаў розны люд і забудоўваў горад. На Дняпры пры Траецкім манастыры паўстаў адмысловы гандлёвы "Літоўскі гасьцінны двор", дзе складваліся вялізарныя скарбы тавараў. Ува ўсходняй частцы гораду, каля нова-збудаванага Духавага манастыра, паўстаў яшчэ адзін гандлёвы асяродак.

Расло і багацела жыхарства Смаленшчыны і разам з гэтым давала шмат дзяржаўных дзеячоў з свайго асяродзьдзя. Гэткім слаўным дзяржаўным мужам, выдатным беларускім дзеячом XVI ст. ваеньнікам, юрыстым, дыплёматам, літаратарам і філёзафам з вылучна сьветлай галавой, быў рэдактар і выдавец ведамага Беларускага г.зв. Літоўскага Статуту — Лявон Сапега, які паходзіць з Смаленскіх баяраў.

VI. ПАХОД МАСКВЫ НА СМАЛЕНШЧЫНУ

Красаваньне Смаленску ў Беларускім гаспадарсьцьве было бяльмом на воку Масквы. Ніколі ня спыняла яна сваіх інтрыгаў супраць беларускага Смаленску. Пры Жыгімонтавым намесьніку, князю Андрэю Саковічу, Масква дамаглася бунту, які быў скіраваны супраць князя. Намесьнік змушаны быў уцячы, а на пасад узыйшоў мсьціслаўскі князь Юры. Гэты адразу пачаў далучаць да сябе Віцебск, Полацак. Але варта было наблізіцца беларускаму

войску, як ён адразу-ж даў ходу ў Маскву. У Смаленску ўзнавілася беларуская ўлада.

Але Масква ўмацоўваецца і ўсё больш ды больш заяўляе свае ўяўныя правы на Смаленск, як быццам-бы "вотчину" прашчураў маскоўскіх князёў ад Валадзімера Сьвятога з часоў Кіеўшчыны. Фальсыфікуючы гісторыю Беларусі, разглядаючы яе, як калішнюю "Русь", Масква пачынае лятуцець аб "адзінсьцьве" "Русі" пад маскоўскаю ўладою. Асабліва ўзмацніліся гэтыя прэтэнзіі на Смаленшчыну за князем Іванам III.

Таму беларусы змушаныя былі ўмацоўваць Смаленск. У даўны земляны горад пераводзяць рэзыдэнцыю намесьніка, пакінуўшы старое "княжае места". Прымітыўныя з сяньняшняга гледзішча земляныя і драўляныя ўмацаваньні з вежамі зрабіліся для тэных часоў досыць моцнымі перашкодамі для ворага. Іван III колькі разоў штурмаваў Смаленск. У сьнежні 1512 г. і ў верасьні 1513 г. расейцы ня здолелі здабыць гораду. Беларусы разбуралі ўсе іхныя ночныя падрыхтовы. Толькі ў 1514 г., калі расейцы падвезьлі 300 гарматаў і пачалі бязупынна абстрэльваць горад, які пачаў гарэць, Смаленск быў змушаны 1 жніўня скарыцца. Іван III пайшоў далей на Беларусь, але быў спатканы каля Воршы, і тут маскоўцы ўшчэнт былі разбітыя харобрым беларускім войскам гэтмана Канстантына Астроскага. Было забіта больш за 30.000 маскоўцаў. Маскоўскае войска мела 80.000, а беларускае 35.000.

Памяць аб гэтай славутай перамозе захавалася на даўгія вякі ў нашым народзе, які ў сваёй песьні гэтак апявае бой пад Воршай:

"Ой, у нядзельку параненька,
Узыйшло сонца хмарненька,
Узыйшло сонца над борам,
Па-над Сялецкім таборам.
А ў таборы трубы йграюць,
Да ваяцкае парады зазываюць,
Сталі рады адбываці,
Адкуль Воршу здабываці:
А ці з поля, а ці з лесу,
А ці з рэчкі невялічкі?
А ні з поля, а ні з лесу,
Толькі з рэчкі невялічкі.
А ў нядзельку параненьку
Сталі хлопцы-пяцігорцы,
Каля рэчкі на прыгорцы:
Гучаць разам з самапалаў,
З сяміпалых ад запалаў,
Б'юць паўсоткаю з гарматаў.
Масква стала наракаці,
Места Воршу пакідаці;
А як з Воршы уцякалі,
Рэчку невялічку праклiналі:
"Бадай ты, рэчка, сто лет высыхала,
Як нашая слава тутака прапала;
Бадай высыхала да скапчэньня сьвету
Што нашай славанькі ўжо нету.
Слава Воршы ўжо ня горша.
Слаўся, пан Астроскі".

У вадзнаку гэтае перамогі гэтман Астроскі пабудаваў у Вільні Мікалаеўскую і Сьвята-Траецкую царкву і ў вапошняй умураваў мармаравую пліту з надпісам: "В лето 1514 церковь сю созда князь Константин Острожскій, гетман в. кн. Литовского, в память победы под Оршею над врагом и супостатом веры христіянское, православное, царем Москов-

ским".

Замілаваньне беларускага жыхарства да сваіх павадыроў і радасьць пазбаўленьня ад маскоўскае небясьпекі выявілася ў песьні віленчанаў, якія ў часе звароту в. кн. Жыгімонта Казімеравіча і князя Астроскага спатыкалі іх краскамі і песьняю:

Великославному гаспадару королю
Жигимонту Казимировичу
Буди чэсть и слава на веки —
Победившему недруга своего великого князя
Василия Московского,
А гетману его вдатному князю
Константину Ивановичу Острожскому
Дай, Боже, здорове и щасте вперед лепшое:
Як ныне побил силу великую московскую
Абы побивал стлиную рать татарскую,
Проливаючы кровь их бессурманскую".

(Супральскі і Кароткі Кіеўскі летапіс)

Праўда, хоць і харобра змагалася войска Канстантына Астроскага, але здабыць Смаленск тады не ўдалося. Маскоўскі намесьнік, князь Шуйскі паперавешваў усіх змоўшчыкаў супроць Масквы і ўтрымаў Смаленск. Пасьля гэтага ўсе непажаданыя Маскве беларускія дзеячы былі высланыя з Смаленску, а заміж іх панасылаўся маскоўскі элемент.

VII. БЕЛАРУСЬ АДВАЁЎВАЕ СМАЛЕНШЧЫНУ

Беларусь не гадзілася з адыходам Смаленску да чужое дзяржавы. Беларускія князі неаднакрацьрабілі спробы адваяваць горад (у 1535, 1564, 1579 г.г.). Таму маскоўцы пачынаюць як мага ўмацоўваць Смаленск, мабыць, няпэўна адчуваючы сябе ў гэтым беларускім горадзе. Гандлёвы цэнтар яны перанесьлі ў прыгарад перад замкам за Дняпром, што пазьней называўся "Гарадзенскаю сотняю". Задуманая яшчэ за царом Фёдарам Іванавічам каменная сьцяна вакол гораду была збудаваная за Барысам Гадуновым пад наглядам гарадзкога майстра Хведара Коня.

Але дарма, што Смаленск разбудаваўся ў моцную няпрыступную цьвярдыню, аднак і ён ня вытрываў доўгае аблогі ў 1610-1611 г. 31 верасьня 1610 г. смаленскія сьцены пабачылі перад сабою вялікае войска Жыгімонта III, які прывёў яго з намерам выкарыстаць маскоўскую "смуту" і зьвярнуць Смаленск Ліцьве. Адбыліся жорсткія баі. Горад бязупынна абстрэльваўся з гарматаў, пачаліся пажары, аднак, крывавыя баі трывалі далей, бо войска ў Смаленску давала хоць і безнадзейны, але адчайны супраціў. Толькі праз 10 месяцаў пры цяжкай упорыстай аблозе Смаленск быў здабыты. Гэта было 3-га ліпеня 1611 г. Гэтак, бадай, праз стагодзьдзе Смаленск быў вызвалены з-пад маскоўскага паняволеньня. Заміж расейскіх парадкаў у Смаленску пачалі тэрмінова ўводзіцца новыя заходня-эўрапейскія парадкі. Горад адразу атрымаў маґдэбурскае права і пачаў зьмяняцца на эўрапейскі лад. Гэтым самым Смаленск зноў далучыўся да Эўропы. Але, на вялікі жаль, на гэты раз Літва ўжо перастала быць незалежным задзіночаным Беларускім гаспадарствам. Вунія ліквідавала адзнакі незалежнасьці, пачаўся наступ польшчыны, апалячваньне праз каталіцызм і вуніяцтва беларускага магнацтва,

гвалтоўнае ператварэньне праваслаўных беларусаў на каталікаў і вуніятаў, а праз гэта далей і на палякаў. Адвечна-праваслаўны беларускі Смаленск пачаў, наўсуперак волі жыхарства, забудоўвацца каталіцкімі касьцёламі, езуіцкімі кляштарамі, дамініканскімі і базыліянскамі школамі, а праваслаўныя цэрквы ператвараліся гвалтоўна на вуніяцкія. На Саборнай гары збудавалі катэдральны касьцёл і рэзыдэнцыю біскупа Смаленскай епархіі.

Ад былое свабоды веравызнаньняў і роўнасьці ў правох ў Смаленску за часамі незалежнага Беларускага Княства, цяпер засталіся адны толькі ўспаміны. Вуніяцкія япіскапы ўсё больш і больш прыгняталі праваслаўных. Апошнія на гэта адказвалі зацятым змаганьнем. Змовамі, бунтамі адказваў за ўсё гэта народ. Паўставала шмат праваслаўных брацтваў, якія змагаліся за захаваньне беларускіх народных прынцыпаў, адчынялі беларускія школы, баранілі праваслаўныя цэрквы ад наступу каталіцтва і езуіцтва.

Няправільная, палёнафільская палітыка кіраўнічых колаў рабіла тое, што смаленскае жыхарства, ня бачачы ратунку, пачало схіляць свае надзеі да праваслаўнае Масквы. А тэй толькі гэтага трэ' было, бо гэта стварыла юрыдычнае апраўданьне для ейнай агрэсіі на Захад, давала "падставы" матываваць яе канечнасьцяй "злучыць" з вялікім расейскім народам" ягоную "западную ветвь", далучыць да сябе "западноруссов" — "единокровных" і "единоверных".

Усё гэта паслабляла сілы супраціву маскоўскай экспансіі. Аднак, ня лёгка ўдаецца Маскве адарваць Смаленск ад Беларусі.

У 1612 г. цар Міхал Раманаў шле з гэтаю мэтаю войска на чале з князем Чаркаскім. Той здабыў колькі беларускіх гарадоў, але Смаленску заваяваць ня здолеў. Ды Масква на гэтым ня спыняецца. За колькі часу яна пачынае вялікія вайсковыя падрыхтовы, купляе зброю ў Швэдыі, вырабляе гарматы, рыхтуе дапаможнае войска пад кіраўніцтвам замежных афіцэраў. За 9 гадоў пасьля пачатку гэтае падрыхтовы, у 1632 г., скарыстаўшы бескаралеўе ў Польшчы, маскоўскае войска, пад кіраўніцтвам ужо ведамага ў Смаленску маскоўскага стаўленьніка — Шэйна, аблажыла Смаленск і пачало яго абстрэльваць з 158 гарматаў. Але на дапамогу літоўскаму войску прыйшоў гэтман Радзівіл з Вільні з 33.000 войска і адбіў наступ маскоўцаў. Апошнія змушаныя былі ад наступу перайсьці да абароны ў вакопах, а пасьля зусім адыйсьці назад паводля зробленае ўмовы. Так гэтым разам ганебна для Масквы скончыліся ейныя намаганьні адарваць Смаленск ад Беларусі. І толькі за царом Аляксеем Міхайлавічам, ужо ў часе Лівонскае вайны, колькімі штурмамі маскоўцы здабылі Смаленск (23. VI. 1654 г.).

VIII. СМАЛЕНШЧЫНА Ў МАСКОЎСКІХ АКОВАХ

Пасьля заняцьця Смаленску маскоўцы зараз-жа ўзяліся за ліквідацыю ў горадзе маґдэбурґскага права, заходня-эўрапейскіх парадкаў і пачалі ўводзіць"российские уложе-

ния". Адно толькі засталося на радасьць народу — гэта зварот праваслаўным беларусам усіх цэркваў, што былі перад гэтым ператвораныя на вуніяцкія і каталіцкія. Але і тут царква неўзабаве пачала служыць русыфікатарскім тэндэнцыям маскоўскае палітыкі.

Гандаль і прамысловасьць зноў перайшлі ў прыгарад, куды былі высланыя і ўсе гандлёвыя людзі, бо горад-цьвярдыня зноў пачаў інтэнсыўна ўмацоўвацца. Тут разьмяшчаліся вялікія аддзелы маскоўскага войска.

У часе Лівонскае вайны, як і ўсе беларускія гарады, Смаленск асабліва пацярпеў, шмат гістарычных і культурных помнікаў згінула ў полымі, або пад руінамі.

Паводля Андрусаўскае ўмовы 1667 г., Смаленск ужо надоўга быў далучаны да Расеі і каля трох стагодзьдзяў церпіць маскоўскую нядолю.

Ад часу далучэньня да Расеі Смаленск губляе сваё стратэгічнае значэньне. Толькі за часоў Пётры Вялікага Смаленск зноў умацоўваецца. Рыхтуючыся да вайны з швэдамі, Пётра будуе ў 1706 г. на правым беразе Дняпра Кронвэрк, каб засланіць ім мост, збудаваны пад вежамі, і парахоўніцы. Але швэдзкі кароль Караль XII абыйшоў Смаленск, і бойкі адбыліся каля Палтавы на Ўкраіне.

Вялізарныя разбурэньні зрабіла Смаленску Напалеонаўская армія ў 1812 г. 6 жніўня Напалеон падыйшоў з сваёй арміяй да гораду і, спаткаўшыся з надта моцным супрацівам расейцаў, пачаў абстрэльваць яго з гаўбіцаў выбуховымі гарматнымі набоямі ды запаліў горад з колькіх бакоў. Згарэла шмат выдатных

гістарычных будынкаў і помнікаў.

2-га лістапада, пакідаючы горад, Напалеон спаліў ладную частку яго і ўзарваў 9 вежаў славутае смаленскай сьцяны. Згарэла 45 каменных і 7.568 драўляных будынкаў; 69 каменных і 248 драўляных крамаў. Страты дасягнулі 600.000 рублёў — сума для гэных часоў надта вялікая. Нездарма 1812 г. увайшоў у гісторыю Смаленску, як год разбурэньняў. Пасьля гэтага Смаленск яшчэ больш згубіў сваё былое стратэгічнае і гандлёвае значэньне.

Шмат гадоў пасьля гэтага па ўсім Смаленску былі відаць папялішчы і руіны. Пад таўстымі, нанесенымі ў вяках, напластаваньнямі застыла багатая мінуўшчына гэтага гістарычнага беларускага гораду.

Варта адхіліць заслону часу, зазірнуць у глыб стагодзьдзяў, як зроку паўстаньне абраз таго, што жыў тут беларускі народ, тварыў сваю самастойнасьць, крывёю бараніў сваю дзяржаўнасьць, ствараў багатыя матар'яльныя вартасьці і культурныя помнікі свайго існаваньня і дзейнасьці. Пад гэтымі пластамі глыбака ляжаць сьляды былое славы і магутнасьці. Шмат гавораць беларускаму сэрцу гэтыя помнікі былое велічы, а таму, як кажа Ластоўскі, яны павінны быць для нас сьвятымі, і мы павінны бачыць у іх сьветчаньне "забітай волі крывічоў", а дату далучэньня Смаленску да Масквы — каля трох стагодзьдзяў таму падпісаную Андрусаўскую згоду — павінны разглядаць, як вялікшае злачынства, роўнае Вэрсальскаму трактату і ганебнай Рыскай умове, што пазьней разадрала цела нашае

Бацькаўшчыны на дзьве палавіны і аддала іх нашым ворагам.

Смаленскіх сьцен масыў патужны
ў бязсільлі распластаўся,
Забітай волі Крывічоў
мне ён нагробкам здаўся!...
Андрусаўскі злачын яго ўчыніў
сатрапіяй Маскоўскай:
і дзьвесьці зь лішнім год, цягаючы ярмо,
яго раджайны гоні
кармілі чужакоў і ворагаў пладзілі
Крывіцкае Пагоні.
Аж дзьвесьці цяжкіх год каханьня
сьлязьмі і потам абліваўся...
Смаленск!
Праз мукі, горасьці свае,
у рэшце-рэшт,
Сьвятым для нас ты стаўся!

В. Ластоўскі "На Смаленскіх сьценах"

IX. ВЫДАТНЫЯ СМАЛЕНЦЫ — СЫНЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ГЭНІЯ

Дарма, што былая веліч народнага духу пахаваная ў гісторыі Смаленску, але народ выяўляў сваю сілу і творчы дух у тым, што час ад часу даваў выдатных людзей, якія множылі дасягненьні навукаў і мастацтваў.

Смаленскія беларусы далі нямала выдатных вучоных, музыкаў, пісьменьнікаў, мастакоў. Назавём тут выдатнага беларуса, ураджэнца Смаленшчыны, праф. В. В. Дакучаева — заснавальніка навейшага кірунку навукі глебаведы, якую пасьля сыстэматызаваў ягоны вучань праф. Сібірцаў.

Нельга абмінуць і другога выдатнага беларуса (на'т з сьведамасьці, бо гэтак і называў ён сябе), сусьветна-ведамага дасьледніка Цэнтральнай Азіі, гэн. Міколу Пржэвальскага (1839-1888), які паходзіць з Парыцкага павету і ўзгадаваўся ў Смаленску, а таксама ўдзельніка экспэдыцыяў Пржэвальскага, П. К. Казлова, вучонага—геаграфа, архэалёга і этнографа з Смаленску.

Урэшце, з смаленскіх беларусаў паходзіць і сусьветна-ведамы кампазытар Міхал Глінка, творца опэраў "Іван Сусанін" і "Руслан і Людміла". Кампазытар Глінка нарадзіўся ў 1804 г. у беларускай вёсцы Новапаская, Ельніцкага павету. Там ён узгадаваўся, а пазьней доўга жыў наездамі. Ад маленства ён чуў там беларускую народную песьню і на ёй гадаваў сваё вуха. Першую музычную асьвету Глінка атрымаў пад уплывам канцэртаў аркестры свайго дзядзькі, які прыяжджаў да ягонага бацькі ў госьці разам з сваімі прыгоннымі музыкамі з суседняга двара. Гэтыя музыкі-беларусы ахварбоўвалі ўсімі асаблівасьцямі беларускае народнае музыкі выкананьне якога-хаця музычнага нумару і, апрача гэтага, самі сьпявалі шмат беларускіх песьняў і гралі на розных народных музычных інструмэнтах. Усё гэта ўразіла маладога Глінку і глыбока запала ў ягоную музычную душу, адклаўшы назаўсёды ў ёй сьлед замілаванасьці да мэлёдычнасьці беларускае народнае песьні. Пасьля, творачы выдатныя музычныя творы, Глінка поўнымі жменямі чэрпаў з гэтае скарбніцы. Музыка опэры "Іван Сусанін" цалком прасякнутая беларускімі

народнымі матывамі, якія сусьветнай музычнай крытыкаю памылкова прыймаліся за зьлітак польскіх і расейскіх музычных народных матываў.

Толькі тое, што на карце Эўропы ня было беларускае палітычнай адзінкі, прычынілася да гэткага рабунку беларускае культуры, як адабраньне ад беларускага народу ягоных лепшых сыноў.

Скрозь распаўсюджванае і афіцыйна падтрымліванае ўрадавымі расейскімі коламі атоесамліваньне праваслаўнага веравызнаньня з належнасьцю да "расейскага народу", перасьлед усяго беларускага, паўсюднае панаваньне расейскае мовы ўва ўсіх асьветна-культурных і адміністрацыйных установах, культываваньне расейскага нацыяналізму і палітыка расейскае асыміляцыі беларусаў зрабілі тое, што Глінка гэтаксама, як пазьней і беларус, паводле продкаў, Тодар Дастаеўскі, стварылі шмат славы расейскаму народу. Таксама, як блытаніна паміж каталіцтвам і польскаю народнасьцю, ды нястача агульнага вызнаньня беларускае мовы, як літаратурнае, штурхнулі другога выдатнага сына беларускага народу — Адама Міцкевіча, сына наваградзкага беларускага шляхціча, у вабдымкі польскае мовы, у якой ён стварыў свае паэтычныя пэрлы.

Але, як правільна гаворыцца ў артыкуле В. Ластоўскага "Тодар Дастаеўскі і Адам Міцкевіч, сыны крывіцкага народнага генія" (у часапісе "Крывіч" № 10 за 1926 г.), усе яны былі "цела ад цела і кроў ад крыві" беларускага народу і павінны, хай і ўскосна,

складаць славу беларускаму нацыянальнаму генію. Калі-б гэтыя людзі жылі ў вадроджанай беларускай дзяржаве з панаваньнем беларускае культуры і дзяржаўнай беларускай мовай, бяз сумлеву яны тварылі-б у роднай мове і музыцы і здабылі-б незраўнанай у вяках славы беспасярэдня свайму народу. І тады-б увесь сьвет зусім заслужана ўважаў-бы Глінку за заснавальніка не расейскае, а беларускае нацыянальнае клясычнае музыкі і опэры, і ён быў-бы беспасярэдня нашым гонарам.

Але і без таго Смаленск з поўным правам мае ўсе падставы ганарыцца сваім слаўным сынам — кампазытарам Глінкам, якому ўдзячны горад яшчэ ў мінулым стагодзьдзі паставіў помнік. Ён уяўляе сабою постаць кампазытара з дырыгэнцкай палачкай у руцэ. На п'едэстале надпіс і дата (1885 г.), а па баках у вянку — назовы галоўных твораў. Вакол — агарожа ў выглядзе нотаў. Помнік павінен нам нагадваць пра вялікія творчыя чыны беларускіх сыноў і натхняць на новую творчасьці, і духовую і матар'яльную. Да гэтага-ж кліча і ўся багатая чынамі мінуўшчына беларускага Смаленску.

X. НІ ЗМУС, НІ ГВАЛТ НЯ ВЫНІШЧЫЛІ БЕЛАРУСКАСЬЦІ СМАЛЕНШЧЫНЫ

Усе вучоныя, нават расейскай арыентацыі, заўсёды ў навуковых працах сьцьвярджалі належнасьць Смаленшчыны да Беларусі. Варта прыгадаць працы ведамых вучоных Кіркора, Максімава і Сямёнава, Даўнар-Заполь-

скага, Дабравольскага, Раманава, этнаграфічныя мапы Ахматава, Карскага, Азбукіна, Смоліча і Пікуліка і г.д., працы шмат якіх нямецкіх вучоных, каб пераканацца ў гэтым.

Паводля ўсіх этнаграфічных адзнакаў, як мова, культура, характар, заняткі жыхарства, фізычны тып, вопратка і г.д. смаляне зьяўляюцца карэннымі беларусамі.

Дый не магло быць інакш, бо сама прырода як-бы вылучыла ўсю Беларусь разам з Смаленшчынай у вадну геаграфічна-эканамічную і этнаграфічную асобнасьць

Вялікі эўрапейскі вададзел, што праходзіць праз усю ўсходнюю Смаленшчыну, ды вялікія лясы на поўначы і ўсходзе гэтае краіны (Вокаўскі, Бранскі) уяўляюць сабою якбы натуральныя межы. Усходняя мяжа Беларусі на Волскім вададзеле супадае з кліматычнаю мяжою Вокаўскага лесу і выразна аддзяляе Беларусь з ейным памяркоўным вогкім пад уплывам мора кліматам ад больш кантынэнтальнага і рэзкага клімату Маскоўшчыны.

Гэтыя натуральныя межы супадаюць і з гістарычнымі межамі калішняй Беларускай Дзяржавы, Вялікага Княства Літоўскага, паводля, скажам, Дэўлінскага замірэньня ў 1618 г. дый ранейшых умоваў.

На паўдня і ўсход ад гэтых межаў жывуць беларусы, якія, паводля расавага і этнаграфічнага адзінства, стварылі тую народную асобнасьць, неаддымнай часткаю якое зьяўляюцца і беларусы смаленскія. Як усім беларусам, ім свомыя перш-на-перш тыя-ж самыя асаблівасьці мовы, як пераход "в" і "л" у "ў";

дзеканьне (не здарма і пра смаленцаў кажуць: "Хіба ліха возьме ліцьвіна, каб ён ня дзекнуў"), цеканьне і аканьне, прыдыхное расейскага гуказлучэньня "жж" беларускім "ждж", зьмякчэньне зычных перад мягкімі гукамі ды навет цьвярдое "р".

Дарма, што Смаленшчына знаходзілася пад Расеяй больш, чымся якая іншая мясьціна Беларусі (агулам бяручы 350 гадоў!) і страшэнна русыфікуецца яшчэ больш сяньня, аднак народ і тут захаваў галоўныя асаблівасьці сваe мовы. Тут варта прыгадаць і надрукаваныя ў часе вайны ў беларускай прэсе зацемкі, што да беларускіх усходніх прастораў ("Раніца" № 43 /107/, за 15 лістапада 1942 г.).

Для высьвятленьня стану беларушчыны ў Браншчыне і Смаленшчыне там знойдзем каштоўныя факты, якія падаў беларускі дзеяч, якому давялося ў 1941 г. колькі часу працаваць ува ўсходняй Беларусі. Паводля ягоных сьцьверджаньняў, найбольш зрусыфікаваныя гарады, але на сяле добра выявілася жывучасьць беларускае мовы з усімі ейнымі асаблівасьцямі, прычым, лепш на паўдні, як на поўначы. "Браншчына" ўся аж пад Арол захавала вельмі добра беларускую мову. Тут спатыкаюцца ўсе ейныя асаблівасьці... У Смаленшчыне — беларушчына так-жа добра захавалася, хоць і не ўва ўсіх паветах (ува ўсходніх горш, як у заходніх). Цікава, што і самы Смаленск з моўнага гледзішча ня выглядае надта страшна. Людзі гавораць тут з паважна захаванымі асаблівасьцямі беларускае мовы. Асабліва войстра ўтрымалася

аканьне і дзеканьне. Далей на поўнач беларушчына захавалася адносна добра аж да г. Белага. Гэта пацьвердзіў нават адзін прафэсар-смаленец, які добра ведае гэныя абшары".

Цікава, што і ў самай найноўшай літаратуры аб Смаленшчыне ёсьць багата фактаў, што сьцьвярджаюць належнасьць яе да беларускага этнаграфічнага абшару.

Гэтак, прыкладам, прафэсар П. Чэрных да свае працы *"Историческая грамматика русского языка"* (выданьне другое, Учпедгиз, Масква, 1954 г.) дадаў Дыялектычную Мапу Ўсходнеславянскіх моваў. Паводля гэтае мапы, уся Смаленшчына і Браншчына аднесеныя да тэрыторыяў беларускае мовы.

Вельмі вымоўнае сьведчаньне беларускасьці Смаленшчыны мы маем і ў найноўшай працы ведамага нястомнага навукоўца ў галіне гістарычнай дыялекталёгіі ўсходнеславянскіх моваў, вучня і пасьлядоўніка акад. А. Шахматава — праф. Паўла Растаргуева (1881-1959). Яшчэ ў 1927 г. П. Растаргуеў выдаў знаную каштоўную для навукі працу *"Северско-белорусский говор"*, за якую ён тады атрымаў годнасьць доктара філёлягічных навукаў. У 1960 г. Акадэмія Навук СССР у Маскве пасьмяротна выдала працу праф. П. Растаргуева *"Говоры на территории Смоленщины"*. Дэталёвае вывучэньне гаворак заходняй Смаленшчыны Растаргуеў асабіста праводзіў у 1929, 1930 і 1931 гг. Тады ён зрабіў багата запісаў і беспасярэдніх назіраньняў. Асабістыя назіраньні Растаргуеў падмацаваў адказамі на адмысловую "Анкету па гаворкам Смаленшчыны", якая была надрукаваная Навукова-дасьледчым інстытутам моваў у Маскве і разасланая аўтарам па школах Смаленшчыны ў ліку 510 паасобнікаў. У дадатак Растаргуеў дэталёва прааналізаваў багатыя дыялектычныя матар'ялы і супаставіў іх з дадзенымі археалёгіі, гісторыі, гісторыі матар'яльнай культуры, этнаграфіі. Выкарыстаў ён і "Смаленскі этнаграфічны зборнік" В. Н. Дабравольскага, рукапісныя матар'ялы Акадэміі Навук СССР і Рускае геаграфічнае грамады, як і іншыя матар'ялы. Гістарычна-дыялекталягічнае дасьледваньне праф. Растаргуеў правёў навукова-лінгвістычным мэтадам. Ён з усяго вялізарнага матар'ялу выбраў адно тыя факты, якія былі дасканала задакумантаваныя і мелі дакладны адрас асобы і мясцовасьці, дзе рабіліся запісы.

У гістарычнай частцы П. Растаргуеў азначыў Смаленшчыну, як тэрыторыю, якую займалі смаленскія крывічы, і дыялектная мяжа якое праходзіць па моўнаму разьдзелу паміж беларускімі гаворкамі і сярэднявялікарускімі і паўднёвавялікарускімі гаворкамі. Тут, на Смаленшчыне, пачынаўся гістарычны стык беларускае мовы з расейскай. Старыя гаворкі смаленскіх крывічоў зьявіліся падставаю для беларускае мовы Смаленшчыны. Заходняя Смаленшчына і да сяньня захоўвае беларускі характар свае мовы, хаця-ж шматгадовы ўплыў расейскае школы, адміністраваньне ў расейскай мове, адсутнасьць беларускай кнігі і выключнае карыстаньне расейскай літаратурай, радыё і тэатр робяць сваю справу ў сэньсе паступовай страты самабытных моўных рысаў. Праф. Растаргуеў паказвае, як у вы-

ніку перасяленьняў і мяшаньня насельніцтва на тэрыторыі Смаленшчыны, удзелу ў грамадзкім і палітычным сучасным жыцьці на фавесцы і працы шматлікіх смаленцаў на фабрыках у Ярцаве, - русыфікацыя здабывае сабе ўсё больш смаленцаў. Некаторыя высновы праф. Растаргуева наводзяць на пэсымістычныя думкі. Падкрэсьліваючы працэс моўных зьменаў, дасьледчык піша аб тэндэнцыях зьменаў, дасьледчык піша аб тэндэнцыях моўнага руху ў бок расейскае мовы: "Стан гэтых рысаў, — піша Растаргуеў — у гаворках Смаленшчыны гэткі, што можна гаварыць аб разьвіцьці гаворак па шляху страты іхных карэнных беларускіх рысаў і замены іх расейскімі" (стар. 181). Але сам аўтар пры гэтым адзначае адно тэндэнцыі працэса зьмены гаворак, але ён зусім не запярэчвае беларускую аснову іх, асабліва ў моўна-гістарычным пляне. Гэтаму сьведчаньнем зьяўляецца вялізарны і каштоўнейшы матар'ял, прыведзены Растаргуевым на балонках гэтае кнігі, што да фанэтыкі, марфалёгіі, лексікі і сынтаксіса мовы смаленцаў. Цэлы шэраг цікавых фактаў моўных назіраньняў і запісаў гэтак і пераліваюцца і зіхацяць жывою беларушчынай, прыкладам ілюстрацыі да разьдзелу аб вакалізьме, дыссымілятыўнага аканьня, вымовы галосных у першым складзе перад націскам, кансанантызма, асабліва наяўнасьць беларускага *г*, перад білябіяльнага **w** у *ў* або *у*, пераважаньне формаў мінулага часу дзеясловаў з канчаткам на *ў* замест *л*, дзеканьне і цэканьне.

Багата цікавых арыгінальных беларускіх словаў Растаргуеў прывёў у альфабэтным

парадку нязьменных словаў і скланяльных і спрагальных формаў. У разьдзеле словаўтварэньня нельга абыйсьці міма тыпова беларускіх суфіксаў ёнак — Іванёнак, Пятронак, прозьвішчы ад уласных імёнаў — Сьцяпанчыкаў, Сілаенкаў, Марыянкоў. Стары смаленец М. Палашонкаў з вёскі Надва, Катынскага павету на Смаленшчыне, расказаў Растаргуеву, як у пачатку 40-х гадоў мінулага стагодзьдзя ён "прыстаў у прымні" і ажаніўся на гаспадаровай дачцы Ганьне, прыняўшы прозьвішча жонкі "Палашанька" ад імя Палаха — "Палаша". Вось жа мова гэтага смаленца нагэтулькі чыста-беларуская, што можа больш вымоўнага прыкладу беларускасьці мовы смаленцаў і не патрабуецца. Наўсуперак некаторым высновам, увесь фактычны матар'ял кнігі праф. Растаргуева *"Говоры на территории Смоленщины"* цалкам падцьвярджае нашыя думкі і навукова-лінгвістычна падмуроўвае іх, стварае нашым высновам неабвержаны фундамант.

Гэтак моцна народ трымаецца свае мовы нават там, дзе на зьліквідаваньне яе было ўжыта безьліч моцных сродкаў, як вылучна расейская школа, друк, тэатар, літаратура, прызнаньне за ўрадавую толькі расейскае мовы, гвалтоўная забарона ўсяго беларускага і перасьлед тэрорам усялякае праявы беларушчыны.

Аднак-жа ні змус, ні гвалт канчальна ня вынішчылі беларускае душы смаленца, бо ейныя асаблівасьці маюць моцныя традыцыі ў мінуўшчыне.

Паходзячы ад асноўнага беларускага плямя

крывічоў і жывучы праз стагодзьдзі ў ваднэй дзяржаве з усімі беларусамі, смаленцы не маглі ня мець аднае з імі мовы. Смаленскі беларус, пераважна селянін, гэткі, як і ўсе беларусы. Падставай ягонага быцьця зьяўляецца здаровая землябробская праца. І хоць прырода не дала смаленцу багатае глебы, аднак стараннасьць і ўпорыстасьць ягонае працы на малаўраджайных глебах можа зьдзівіць. Смаленскі селянін шмат перапрабаваў за жыцьцё заняткаў, часам адыходзіў ад зямлі на заработкі, але далей за сваю смаленскую краіну, далей за Парэчча, за дняпроўскія ды дзьвінскія прыстані ён не вандруе і ня возіць. Урэшце ўсё-ж ткі ён вяртаецца на сваю няўдзячную зямлю і ўкладае ў яе ўсю сваю сталую любасьць да працы, цярплівасьць, упорыстасьць, усе высілкі, і пад ягонымі працавітымі рукамі камяністыя і пяшчаныя глебы ператвараюцца ў шырокія нівы.

Не заўсёды зямля бывае ўдзячнай гаспадару за гэтую працу, і тады міжвольна складае ён сумную песьню:

Няма хлеба, солі,
няма шчасьця, долі!
Поле пусьцеець,
І нечым сеяць.
Ня будзем жыці,
Пойдзем блудзіці.

Але гэта толькі вывява ягонага мягкага пяшчотнага беларускага характару з ягоным нахілам да лятуценнасьці, багатага ўяўленьня і фантазіі. Ня пойдзе ён у сьвет блудзіць, бо ведае, што ня ласкаю стрэне яго чужынец.

Чужая старана
Тугою араная,
Сьлязьмі паліваная.

Смаленскі селянін мае на запас і прыказкі: "Паміраць зьбіраешся, а жыта сей". Вось-жа і ня ідзе ён з свае зямлі, якая бачыла ў вяках тут ходаньне шмат якіх сілаў. Сядзіць на ёй смаленец ужо шмат вякоў і ўратоўвае сябе ад асыміляцыі. З чыста беларускай асаблівасьцю даматурства трымаецца свайго палетку, свае мовы, і гэтым бароніцца ад страты свае нацыянальнасьці. А пра свайго ўсходняга суседа мае добрае дазнаньне, што выпрацавалася ў вяках зяцятага ходаньня Беларусі з Масквою і выеўленае ў дасьціпных прыказках.

"Калі маскаль кажа суха, то падымайся да вуха: бо ён брэша".

"Ад чорта адхрысьцішся, а ад маскаля не адмолішся: ад маскаля полы падрэж ды ўцякай".

Гэтак выразна ўсьведамляе сваю адрознасьць ад расейца смаленскі беларус і замацоўвае гэтае ўсьведамленьне ў вуснай народнай творчасьці. Ды ўжо гэтае адрозьненьне найлепш робіць і сама мова смаленца, багатая агульна-беларускімі словамі, як хата, кубел, калыска, бажніца, пол (замест расейскага "Полати"), страха, катух, хустка, камізэлька (замест расейскага "жилет"), хадакі ці чаравікі, кавалак, андарак ("і ў людзі і ў кабак — усё адзін андарак"), кравец, шавец, магерка, сьвітка, намітка, бохан, клёцкі, калдуны, ладкі, панцак, крупнік, шмалец, страва, бульба, крыніца, шкода (зам. рас. "беда") іг.д. г.п.

Усе гэтыя словы, як ня трэба лепш, сьветчаць пра лучнасьць смаленскага слоўнікавага складу з агульна-беларускім. Апрача таго, кажнае з іх зьяўляецца добрым паказьнікам беларускасьці ўсіх жыцьцёвых абставінаў смаленскага селяніна, яны, нераўнуючы, тыя насымбалі, што хаваюць за сабой беларускі нацыянальны характар, усяго гэтага багацьця, у якім гэтымі словамі называюцца асобныя рэчы ці зьявы і комплекс якіх дае шырокі абраз іхнага нацыянальнага твару. Смаленскі акруговы слоўнік Дабравольскага дае дзеля гэтых выснаваў багаты матар'ял.

Аб беларускім складзе народнае мовы Смаленшчыны могуць добра сьветчыць, прыкладам, гэткія, пададзеныя Максімавым, сказы вазьніцаў перад карчмою да шынкара:

— "Рандар, рандар! адчыні вароты: дай гарэлкі! Ах-ці якая мяцеліца: саўсім перазяблі, і коні чуць цягнуць, і ноч цёмная, нічога ня відна, і дарогу так замяло, што і найці ня можна. Рандар, рандар, адчыні вароты, налівай гарэлкі!"

Трэба вызнаць і немалы ўклад Смаленшчыны і ў найноўшае беларускае адраджэньне. Ведама, што смаленскія дэлегаты, удзельнікі Першага Ўсебеларускага Кангрэсу ў Менску ў сьнежні 1917 году найбольш пасьлядоўна абаранялі пагляды незалежнікаў, ня ў прыклад магілеўскім "абласьнікам". Смаленскія дэлегаты ўсьвядомлівалі сябе дзецьмі маці-Беларусі і найбольш адкрыта і рашуча дамагаліся дзяржаўнага самавызначэньня Беларусі на ўсіх ейных этнаграфічных абшарах.

Смаленшчына дала беларускай літаратуры такога выдатнага пісьменьніка, як Максім Гарэцкі, які ўзбагаціў беларускую літаратурную мову багацьцем моўнае адмены нашае ўсходняе поўначы. У смаленскай вёсцы Калесьнікі, Хіславіцкай воласьці, нарадзіўся беларускі паэт Зьмітрок Астапенка (1910-1944), які таксама, як і Гарэцкі, унёс багата смаленскіх арыгінальных словаў у беларускую паэзію. Уцякаючы ад саветаў праз Славаччыну, ахопленую паўстаньнем у 1944 годзе, Астапенка загінуў з словамі звароту да любай Беларусі, словамі бязьмежнай любові да бацькаўшчыны, якой ён аддаў сваё кароткае, але творча плённае жыцьцё. Ягоная паэма "ЭДЭМ" і шматлікія вершы цалкам спраўдзілі прадбачаньне Якуба Коласа, які ў 1928 годзе, будучы ў Мсьціслаўлі ў Пэдагагічным Тэхнікуме, падараваў Зьмітраку Астапенку сваю кнігу з надпісам, у якім прадракаў будучыню вядомага паэты і тым акрыліў малады талент.

Вывучэньне моўных асаблівасьцяў Смаленшчыны можа быць асабліва плённым для збагачэньня беларускае мовы. Прыкладам, колькі прыгожасьці і самабытнае адмены хаваецца ў словах, запісаных на Смаленшчыне і прыведзеных А. Адамовічам на адной з дыскусійных зборак у Нью-Ёрку ("Конадні", №3, 1955, бал. 94-95). Вось некаторыя зь іх: утравець (зарасьці травою), асянець, абасянець (рабіцца надвор'ю, як увосень), раўніць (дзяліць на роўныя часткі), ірміцца, зайрміцца ў сэньсе загарэцца нейкім пачуцьцём, глыбіць (дамагацца), дымна (цяжкі настрой), работашна (шмат работы), вуздыхна, зямель-

на, улюбі (у каханьні), уцьверазі (у цьвярозасьці), час улягу, угадзіне (позьні час), удаліна (чужына). Або гэткія сынонімы і антонімы: разумлівы, бязумлівы, безум, касьнік (прамень), адкосак (водбліск), шумцець, шумархаваць, гульлі ваць, народліва, прынародна, заўвеціць, заўвета (ветлая заўвага), загада, закор (дакор), маладзьга (аб моладзі грэбліва), прыродак (прырода), падаўтараць (паўтараць яшчэ раз), пераказваць (паўтараць у гаворцы), падаваць (быць падобным), працяглівы, накупіць (падкупіць), намахнуцца, басавік (басяк), нямінучая (нямінучасьць), вухарэз (галаварэз), гарывы (гарысты), нізовы, гулявы (гуляшчы), лёгкаабычны (лёгкадумны), цанаваць (цаніць), собства (уласнасьць), пульга (завея), маравы (морскі), маранік (марак), праказацца (праявіцца), ціхім маньнем ("ціхай сапай"), на гулянках (вольным часам), абкіраваць (арганізаваць справу), налажыць імя (даць імя), пакласьці (умовіцца), паклад (умова), вомяга (атрута), выйма (міма), сплавадзіць (збыць), наплавадзіць (навадніць), мазны, мазьненькі (мізэрны), паднебесь (гарызонт), заняважыць (зьбянтэжыць), пасылаваць (камандыраваць), паязда (экспэдыцыя), судлівы (крытычны), судлівіць (крытыкаваць), чырку-чырк (акурат).

Сп. А. Адамовіч таксама прапанаваў колькі смаленскіх словаў на зьмену ўжываемым часта барбарызмам і жарганізмам (глядзіце тамжа). Яны вартыя ўвагі ўсіх беларускіх моваведаў. Варта прывесьці і іх: намінаць, намінка (намякаць, намёк), перагосткі (абмен візытамі), адгосткі (паўторнае адведаньне), хаджане (праходжыя), увед (іспыт), спытка ("пробка"), мульлё (пролежні), машурга (мішура), прагрычыць (празяваць), брыжыковыя дзяўчаты ("кисейные барышни"), здобіль ("изобилие"), дасьпяшны (пасьпяховы), дасьпех (посьпех), посуд (судно, шугавы (ветраны чалавек), весьці за (уважаць за).

Агромністую колькасьць самабытных словаў заключае ў сабе ведамы "Толковый словарь живого великорусского языка" Уладзімера Даля, у 4-х томах. Багата іх у вядомым слоўніку беларускае мовы Насовіча. Значная частка гэтых словаў ўжываецца і ў іншых мясцовасьцях Беларусі і ўвайшла ў агульна літаратурную сучасную беларускую мову. Уклад смаленцаў тут асабліва вялікі і заслугоўвае свайго вызнаньня і належнае ацэны, а таксама навуковага вывучэньня. На вялікі жаль, гэтае вывучэньне ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы вельмі запынілася дзеля ўлучэньня Смаленшчыны ў склад Расейскае Фэдэратыўнае Савецкае Рэспублікі. Таму беларускія моваведы пры Інстытуце Мовазнаўства Акадэміі Навук БССР у Менску змушаныя абмяжоўваць абсяг сваіх дасьледваньняў межамі сучаснае БССР. Праўда, у 20-х гадох Смаленшчына вывучалася беларускімі навукоўцамі, і тады шмат было зроблена для яе вывучэньня ў Інстытуце Беларускае Культуры, а на пачатку і ў Беларускай Акадэміі Навук у Менску.

А паслухайце народныя песьні Смаленшчыны. Гэта тыпова беларускія народныя песьні з тэю-ж самаю моўнаю і музычнаю асноваю. Для прыкладу, вазьмеце жартоўную (у

зборніку Дабравольскага, ч. IV):

Да сею-ж я (2)
У гародзе чарнушачку,
Пад гародам пятрушачку,
Да сею-ж я.
Да палю-жа я
У гародзе чарнушачку,
Пад гародам пятрушачку,
Да палю-жа я. (2)
Да бяру-жа я (2)
У гародзе чарнушачку,
Пад гародам пятрушачку
Да бяру-жа я .
Навару-жа я (2)
Да старому качана з бураком,
Маладому кісяля з малаком,
Навару-жа я. (2)
Пасьцялю-жа я (2)
Да старому на ўзапечкі,
Маладому да на покуце,
Пасьцялю-жа я. (2)
Падлажу-жа я (2)
Што старому да дзяружачку,
Маладому да падушачку,
Падлажу-жа я. (2)
Прабуджу-жа я (2)
Што старога ды піхаючы,
Маладога абдымаючы,
Прабуджу-жа я. (2)
Праваджу-жа я (2)
Як старога із сабакамі,
Маладога із музыкамі,
Праваджу-жа я (2).

Цікава адзначыць той факт, што ў выданьне Беларускай Акадэміі Навук — "Песьні беларускага народу" т. I, Менск 1940 г., увайшло шмат беларускіх песьняў, запісаных на Смаленшчыне ведамымі этнографамі, як Дабравольскі з ягоным "Смаленскім этнаграфічным зборнікам" ч. I, 1891 г., ч. II, 1893 г., ч. IV, 1903 г., як Насовіч, Раманаў і інш.

У кнізе "Песьні беларускага народу", часта ўзорам песьні і прыводзіцца толькі песьня Смаленшчыны. У тым-жа выпадку, калі за ўзор даецца песьня з цэнтральнае Беларусі, дык у камэнтарах вельмі часта паказваецца на запісы тых самых песьняў або іхных варыянтаў у Смаленшчыне з паказаньнем літаратуры і бібліяграфічных дадзеных. Гэта гаворыць аб адзінсьцьве беларускае народнае песьні ад беларускае Горадзеншчыны да самых усходніх і паўночных абшараў Смаленшчыны. Адзін народ — адны і тыя-ж у яго і песьні.

Смаленскі і бранскі селянін на кірмашы ды ў людзі, як і ўсе беларусы, выняжджалі ў белай магерцы і шэрай сьвітцы, а за клясычны народны інструмэнт у іх так сама — беларуская дуда — скураны круглы мяшок і прыткнутая да дзіркі дудка з пераборам для пальцаў, якая грае і тады, калі ў яе пакідаюць дзьмуць.

Смаленскі беларус, як і ўсе беларускія сяляне,на працягу гісторыі застаўся абыякавым да розных рэлігійных змаганьняў і не даваў із свайго асяродзьдзя духовых фанатыкаў, палоненых якой-небудзь рэлігійнаю догмаю.

Беларус заўсёды адзначаўся рэлігійным індыфэрэнтызмам і таму не паддаўся ўплывам розных рэлігійных сэктаў, якіх так багата было ў ягонага ўсходняга суседа. Жыцьцё на воддалі ад гарадоў спрыяла захоўваньню свае

нацыянальнае самабытнасьці ў в а ў с і м жыцьці.

Гэтую нацыянальную беларускую самабытнасьць, як перакакальна сьветчаць усе пададзеныя намі вышэй факты, нават смаленскі беларус захаваў аж дагэтуль, наўсуперак усім нягодам і перагасам лёсу, што найцяжэй з усіх беларускіх краінаў выпалі на долю Смаленшчыны. І дарма, што цяпер Смаленшчына пераживае чужое панаваньне, ніякая пякельная сіла — мы ў гэта моцна верым — ня зьверне яе з адвечнага радзімага беларускага шляху і, ступаючы ім, і гэтая нашая дарагая пакутніца раней ці пазьней прыйдзе да таго поўнага задзіночаньня з усёй Вялікай Беларускай Бацькаўшчынай, да якога імкнецца вякамі.

І аб ёй таксама можа сказаць кажны з сьведамых сыноў гэтае Бацькаўшчыны словамі таго паэта, які калісьці з такім замілаваньнем прапушчаў вачыма "прысады а блоні" яе:

Люблю я цябе, дарагая,
І веру: ня спынішся раптам,
Праз пушчы, бярэзьнікі, гаі
Да Менску заўсёды патрапіш!

Студзень 1943 — 1961

**
*